Інстытуту журналістыкі БДУ – 70 гадоў

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

1 снежня 2014 года, № 17 (2120)



ДАРАГІЯ СЯБРЫ!

Прыміце шчырыя віншаванні з 70-гадовым юбілеем!

Факультэт журналістыкі БДУ, а цяпер – Інстытут журналістыкі – найстарэйшая ў Беларусі кузня прафесійных кадраў для СМІ. Штогод сотні выпускнікоў папаўняюць шэрагі работнікаў друку, радыё, тэлебачання, інтэрнэт-медыя. Несумнеўныя заслугі прафесарска-выкладчыцкага складу Інстытута журналістыкі ў паступальным развіцці нацыянальных СМІ.

Шчыра спадзяюся, што традыцыі, закладзеныя факультэтам журналістыкі, будуць славіцца яшчэ доўгія гады. Жадаю ўсім супрацоўнікам, студэнтам і выпускнікам журфака плённай працы, аптымізму, шчасця і дабрабыту.

Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Л. С. АНАНІЧ

ШАНОЎНЫЯ КАЛЕГІ!

Ад імя рэктарата ўніверсітэта і сябе асабіста віншую ўсіх выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў і выпускнікоў з 70-годдзем факультэта журналістыкі БДУ!

Ён, створаны ў 1944 годзе, стаў першым факультэтам журналістыкі ў сістэме дзяржаўных універсітэтаў усяго Савецкага Саюза. Кіеўскі журфак быў заснаваны ў 1946 годзе, а маскоўскі – у 1947-м.

У 2008 г. факультэт пераехаў у сучасны навучальны корпус на Кальварыйскай, на ўрачыстым адкрыцці якога выступіў кіраўнік дзяржавы. Вынікам паступальнага развіцця стала пераўтварэнне факультэта журналістыкі ў Інстытут журналістыкі БДУ.

Цяпер Інстытут журналістыкі ўяўляе сабой магутны комплекс па падрыхтоўцы спецыялістаў у розных галінах журналістыкі, літаратурнай творчасці і масавых камунікацый. Трансфармацыі спецыяльнасцей і кафедраў красамоўна сведчаць пра яго імклівы рост, станаўленне навуковых і адукацыйных школ, якія закладваюць асновы развіцця сучасных беларускіх сродкаў масавай камунікацыі.

За час свайго існавання Інстытут журналістыкі стаў адным з найбольш прэстыжных навучальных падраздзяленняў БДУ, сёння гэта адзін з вядучых адукацыйных і навуковых цэнтраў у сферы масмедыя і масавых камунікацый на постсавецкай прасторы.

Жадаю ўсяму інстытуту новых перамог, а кожнаму члену калектыву персанальна – здароўя, прафесійных поспехаў і здзяйсненняў, бесперапыннага навуковага, педагагічнага, творчага ўдасканалення! Хацелася б, каб маладыя людзі – студэнты і выпускнікі – няспынна прымнажалі і захоўвалі найлепшыя традыцыі і дасягненні інстытута, пацвярджаючы высокі статус альма-матар і непахісны аўтарытэт у беларускай журналістыцы, літаратурнай творчасці, камунікатывістыцы.

Рэктар БДУ акадэмік С. У. АБЛАМЕЙКА

ПАВАЖАНЫЯ КАЛЕГІ-ВЫКЛАДЧЫКІ, СУПРАЦОЎНІКІ І СТУДЭНТЫ!

З нагоды юбілею нашага Інстытута можам з пачуццём вялікага гонару адзначыць, што ўсе разам мы змаглі многае зрабіць, шмат чаму навучыцца. За 70-гадовы перыяд больш за 8 тысяч маладых і таленавітых людзей атрымалі дыплом журналіста, сталі выдатнымі прафесіяналамі, грамадскімі, культурнымі і палітычнымі дзеячамі. Шмат выпускнікоў працуе сёння за межамі Рэспублікі Беларусь.

Мы бачым, колькі яшчэ патрэбна здзейсніць, колькі перад намі магчымасцей зрабіць нашу alma mater найлепшай у свеце па падрыхтоўцы спецыялістаў для сродкаў масавай інфармацыі.

Вялікая падзяка ўсім тым, хто сёння вучыцца, выкладае, а таксама носіць ганаровае званне ЖУРНАЛІСТ!

Шаноўныя калегі! У Дзень нараджэння зычу ўсім моцнага здароўя, дабрабыту, вялікіх поспехаў у вучобе, навуцы, педагагічнай і прафесійнай дзейнасці.

Дырэктар Інстытута журналістыкі С. В. ДУБОВІК

Праўда як лад жыцця прафесара Стральцова

Універсітэты моцныя сваімі традыцыямі, аснова якіх – праца і лёс вялікіх Настаўнікаў. Гады выкладання, навуковыя і журналісцкія працы прафесара Барыса Васільевіча Стральцова – значная і слынная частка гісторыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Ён заснавальнік навуковай школы беларускай журналістыкі, аўтар дзясятка манаграфій, навучальных дапаможнікаў, сотні публіцыстычных артыкулаў. Яго пяру належыць раман, некалькі аповесцяў, мноства апавяданняў і лірычных мініяцюр.

Усе, хто прайшоў журфак, маюць уласную гісторыю-ўспамін пра Барыса Васільевіча Стральцова. Спакойны, разважлівы, адкрыты, заўсёды з усмешкай у вачах, ён ніколі не павучаў, дазваляў захоўваць унутраную волю, і ў гэтым была яго выкладчыцкая мудрасць. Ён не замінаў сваім вучням станавіцца тымі, кім яны могуць стаць. За дзесяцігоддзі, аддадзеныя прафесіі, думаю, Барыс Васільевіч не аднойчы пераконваўся, як цяжка журналістыцы навучыць. Можна толькі навучыцца.

Стральцова звалі каралём беларускага нарыса. Але сам ён з лёгкасцю і самаіроніяй ставіўся да высокіх слоў у свой адрас. Распавядаў, калі прачытаў у газеце, што ён – «легенда беларускай журналістыкі», смяяўся да слёз.

У адным з інтэрв'ю Барыс Васільевіч пазначыў сябе так: журналіст, для якога журналістыка не толькі прафесія, але і лад жыцця. Студэнты і калегі памятаюць, ён любіў цытаваць публіцыста Аграноўскага: «Добра піша не той, хто хораша піша, а той, хто добра думае». Мяркую, для прафесара Стральцова ў гэтых словах змяшчалася «соль» журналісцкага рамяства, якая заключаецца зусім не ва ўменні хвацка напісаць тэкст ці дастаць «гарачы» факт.

Хутчэй, для Барыса Васільевіча журналістыка была спосабам пазнаць і перадаць праўду жыцця, якую ён шчыра лічыў рэальнай катэгорыяй, якой заўсёды трымаўся сам і вучыў прытрымлівацца нас, сваіх вучняў. Сёння наш абавязак – захаваць і працягнуць традыцыю, створаную прафесарам Стральцовым. Памятаеце, як ён казаў: «Такім жа манерам...»?

Наталля ФЯДОТАВА

Злева направа: І. І. Сачанка, Б. В. Стральцоў, М. Я. Цікоцкі, Р. В. Булацкі

Р. В. Булацкі:

«Я заўсёды адстойваў кожнага студэнта»

– Рыгор Васільевіч, Ваша імя – гэта ўжо гісторыя... Вы былі першапраходцам у развіцці сучаснай беларускай журналістыкі, першым дэканам факультэта журналістыкі БДУ. Які ж пачатак усёй гэтай вялікай працы?

– Вайна перашкодзіла ўсяму: і маёй вучобе, і ўсім марам. Шчыра кажучы, сам я ніколі не марыў стаць журналістам. У 1939 годзе мяне прынялі на гістфак БДУ. Хацелася працаваць настаўнікам гісторыі...

А на вайне я стаў баявым штурманам. Пасля заканчэння Мелітопальскага авіяцыйнага вучылішча апынуўся на Далёкім Усходзе. З маімі сябрамі – лётчыкам Ульянавым і тэхнікам Пятровым – купілі на ўласныя зберажэнні самалёт, на якім удзельнічалі ў баях ва Украіне, у Румыніі, Венгрыі, Чэхаславакіі, Югаславіі, Аўстрыі. У 1946 годзе я стаў перад дзвярыма БДУ, будучы ўжо інвалідам Вялікай Айчыннай вайны.

Хацеў працягваць вучобу на гістарычным факультэце, але рэктар накіраваў на аддзяленне журналістыкі, калі даведаўся, што да вайны я друкаваўся ў бабруйскай газеце «Камуніст» пад рэдактарскім вокам Міхася Лынькова. У 1951 годзе я выдатна закончыў аддзяленне журналістыкі і працаваў рэдактарам шматтыражнай газеты. Адначасова вучыўся ў аспірантуры і ў 1953 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю.

Пасля пачалася доўгая барацьба за станаўленне факультэта журналістыкі. У 1967 годзе дабіўся перайменавання аддзялення журналістыкі ў факультэт і стаў першым яго дэканам.

– Чым Вам запомнілася студэнцкае жыццё? Як Вы думаеце, студэнты мяняюцца з часам?

– Вядома, мяняюцца! Сённяшнія студэнты больш ведаюць і больш падрыхтаваныя, чым мы, пасляваенныя. А вось уважлівасці да заняткаў у цяперашніх значна менш. Няма адказнасці за вучобу, а раней яна была. Я, напрыклад, у свой час вучыўся наогул без святла, затое стыпендыя была нядрэнная, з яе дапамогай я падняў на ногі сваю сям'ю ў вёсцы. І хлопцаў на журфаку ў мінулыя гады было вельмі шмат, а зараз чамусьці ўсё не так...

– Што засталося ў Вашым жыцці або душы пасля сямнаццацігадовай працы дэканам?

– Я заўсёды адстойваў кожнага студэнта, клапаціўся, каб студэнцкае жыццё было цікавейшым. Так, пры дапамозе студэнтаў я стварыў ансамбль, тэатральную студыю. Амаль сорак шэсць гадоў я чытаў лекцыі студэнтам. У мяне ніколі не было канспекта. Я думаў: калі выйду з паперкамі, студэнты не будуць паважаць, скажуць – сам нічога не ведае, а вучыць...

Вольга БАРАБАНШЧЫКАВА, з архіву 1994 г.

Н. А. Сніцарава:

«Мая скразная дарога»

Ніна Аляксандраўна Сніцарава – імя, знаёмае ўжо не аднаму пакаленню журналістаў. Аддаўшы ўсё жыццё факультэту журналістыкі, яна дамаглася павагі і заслужанага прызнання шматгадовай працы.

А пачалося ўсё ў цяжкім 1944-м. Тады яе, толькі пасля трохмесячных агульнаадукацыйных курсаў, прынялі ў шэрагі першых студэнтаў факультэта журналістыкі. Вучоба моцна адрознівалася ад цяперашняй, бо факультэт толькі пачынаў сваё існаванне – не было дакладных навучальных планаў, пастаянных прадметаў і нават выкладчыкаў. Што хаваць, і пастаяннага будынка не было. Месца не хапала, бо пасля вайны ў разбураным горадзе аднавілі працу ўсе факультэты. Будучым журналістам часта даводзілася «вандраваць» па школах.

Першыя заняткі праходзілі ў былым памяшканні фізфака. Гэта «чырвоны дом» – двухпавярховы будынак, дзе размяшчаліся і дэканат, і парткам, і мясцкам. Там меўся адзін маленькі пакойчык, які часам аддавалі ў валоданне журфакаўцам.

Пасляваенны курс быў вельмі неаднастайны: атрымлівалі адукацыю студэнты розных узростаў, узроўню падрыхтоўкі, спецыяльнасцяў. Сярод іх былі і такія, як Ніна Аляксандраўна, хто да вайны паспеў скончыць сем класаў, і такія, хто прайшоў партызанскі шлях, і тыя, хто ўжо меў вопыт працы.

Ніна Аляксандраўна скончыла факультэт на выдатна, і ёй адразу прапанавалі паступаць у аспірантуру. Навуковага кіраўніка ў гэтай сферы ў БДУ не знайшлося – прыйшлося ехаць вучыцца ў Маскву. Пары праводзіла ў Мінску, а для напісання работы і падрыхтоўкі лекцый перыядычна адлучалася ў сталіцу. Яна вучылася выкладаць, студэнты – спасцігаць новыя дысцыпліны.

– Я ўсё жыццё адчувала і працягваю адчуваць вялікую ўдзячнасць да Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, – не хавае слоў прызнання Ніна Аляксандраўна. – Мне, сямікласніцы, ён даў пуцёўку ў жыццё, стаў скразной дарогай. Я ганаруся, што вучылася і вучыла менавіта ў гэтай кузні беларускай навукі!

Лідзія СКУЛАВЕЦ, Яна ЧАРАПАНАВА

Н. А. Сніцарава, Е. Л. Бондарава

Е. Л. Бондарава:

«Журналістыка для мяне пачалася з практыкі»

Ефрасіння Леанідаўна Бондарава – знакаміты кіназнаўца, крытык, доктар навук, прафесар БДУ, аўтар шматлікіх кніг, выдатны педагог і журналіст.

– Ефрасіння Леанідаўна, раскажыце, калі ласка, калі ў Вас узнікла жаданне паступіць на журфак?

– Жаданне займацца журналісцкай творчасцю з'явілася ў мяне яшчэ ў школе, пасля заканчэння якой я паступіла, дарэчы, без здачы ўступных экзаменаў на філалагічны факультэт Ленінградскага ўніверсітэта. Правучыўшыся на філфаку адзін семестр, я паехала дадому, каб зарабіць крыху грошай, бо раптам пачалася вайна, якая змяніла ўсе планы... Пасля вайны сакратар Лёзненскага райкама камсамола Тамара Дубоўка адшукала мяне і сказала: «Ідзі ў рэдакцыю, бо няма каму працаваць!» І я пайшла зноў у раёнку. Рэдакцыя тады складалася з трох чалавек – давялося рабіць усё. Такім чынам, журналістыка пачалася для мяне адразу з практыкі, тэорыя была потым.

– Як Вы прыйшлі да выкладчыцкай дзейнасці?

– Спачатку я не думала навукай сур'ёзна займацца, але, калі мне прапанавалі паступіць у аспірантуру, я палічыла, што гэта ўсё ж такі нейкае паглыбленне ведаў, нейкі самакантроль, і гэта будзе на карысць той справе, якой я хацела займацца, – даследаванню кіно. З 1953 года, пасля абароны дысертацыі, я пачала выкладаць.

– Ефрасіння Леанідаўна, назавіце імёны літаратараў, крытыкаў, якія прайшлі Вашу школу?

– Магу, і з задавальненнем. Адам Мальдзіс, Міхась Стральцоў, Іван Пташнікаў, Святлана Алексіевіч, Анатоль Вярцінскі, Пятро Васючэнка, Маргарыта Старых, Людміла Саянкова, Людміла Перагудава, Ігар Аўдзееў. Усе гэтыя людзі робяць адну вельмі важную справу – кожны па-свойму адраджае беларускую культуру.

Арцём КАВАЛЕЎСКІ, з архіву

Парады ад Міхася Цікоцкага

Міхаіл Яўгенавіч Цікоцкі – журфакаўская легенда. Заслужаны дзеяч навукі, вядомы мовазнаўца, аўтар падручнікаў па стылістыцы, па якіх вучылася і вучыцца ўжо не адно пакаленне студэнтаў, прафесар, ветэран вайны, да таго ж – родны сын вядомага беларускага кампазітара Яўгена Карлавіча Цікоцкага... А яшчэ, як запомнілася са студэнцкіх гадоў, – чалавек незвычайна энергічны, з добрым пачуццём гумару...

Некалькі цытат ад прафесара Цікоцкага:

«...У сучаснай журналістыцы амаль зніклі мастацка-публіцыстычныя жанры, у якіх толькі і можа выявіцца па-сапраўднаму майстар слова... А захаванне моўных нормаў у прэсе – гэта даўняя хвароба. Тут усё залежыць ад начытанасці і культурнага ўзроўню аўтара...»

«...Мастацкая літаратура разам з народам стварае мову. Таму да фразы: няма мовы – няма пісьменніка, я дадаю: няма пісьменніка – няма мовы. На кожнага, хто ўзяўся за пяро, ускладзена адказнасць. На журналістаў таксама, бо і яны – пісьменнікі...»

«...Дыялог – гэта ўсё-такі адзін тэкст, ён не можа быць двухмоўны. Я праціўнік таго, калі журналіст і яго суразмоўца ў тэлерадыёперадачах гавораць на розных мовах. Я лічу, што журналіст не павінен падстройвацца пад свайго «героя». Калі чалавек разумее і ведае беларускую мову, яго можна падрыхтаваць, папрасіць, каб адказваў па-беларуску... Калі ж чалавек мовы не ведае або вельмі цікавы і незаменны для гутаркі, можна адступіцца ад свайго нацыянальнага і прафесійнага гонару і гаварыць з ім на яго мове...»

«...Раней сярод студэнтаў было болей такіх, якія сапраўды мастацтвам слова захапляліся. Большасць нашых першых выпускнікоў – члены Саюза пісьменнікаў. Гэта вучні, якімі я ганаруся... Але і сёння цікавасць да слова не страчана, ёсць студэнты, якімі можна будзе ганарыцца праз колькі гадоў...»

Неяк Міхаіл Яўгенавіч пацікавіўся лёсам адной маёй калегі, сваёй былой дыпломніцы. Калі пачуў, што яна з'ехала за мяжу, з нейкім болем і прыкрасцю працытаваў Купалу: «Не шукай ты шчасця-долі на чужым, далёкім полі...». Спрабуючы абараніць калегу, я даводзіла: маўляў, і там яна гаворыць па-беларуску, працуе на беларускамоўным радыё... Але ён запярэчыў: – Добра паехаць адсюль і лямантаваць: «Як мы любім Беларусь!..» Які толк з іх беларускай мовы там? Патрыятызм без плёну для Радзімы – гэта не патрыятызм, а хутчэй спекуляцыя на ім...

Мне засталося толькі моўчкі пагадзіцца...

Алена ЛЯЎКОВІЧ, з архіву

АД ШЧЫРАГА СЭРЦА!

Журфак, люблю цябе за…



Раман МАРЦІНОВІЧ, 2 курс:
– За выбітных людзей, за прыкольную атмасферу, за крутых, маладых, энергічных выкладчыкаў, за сімпатычных, а галоўнае – разумных дзяўчат.

Юлія ІШМУРАТАВА, 4 курс:
– За тое, што журфак – родны дом.

Дар'я ДРАЗДОВІЧ, 2 курс:
– За сваю групу, якая стала мне сапраўднай сям'ёй. За выкладчыкаў, з якімі простыя пары ператвараюцца ў найцікавейшыя 80 хвілін нашага жыцця. За магчымасць весці актыўнае грамадскае жыццё.

Анжаліка ПУШНОВА, 1 курс:
– За справядлівых выкладчыкаў, творчых навучэнцаў, смачную ежу ў сталоўцы і добры wi-fi.

Алена КАЗЮЧЫЦ, 3 курс:
– За людзей, за эмоцыі, якія дорыць факультэт! Самыя яркія – гэта наш футбол.

Марта КУДЗІНА, 3 курс:
– За… я не ведаю. Люблю проста так. Тут табе рады ў любы час.

Станіслаў ЛАБАТЫ, 4 курс:
– За шчырых сяброў, якіх ён мне падарыў, студэнцкія тусоўкі, міні-кафэ і капуснік.

Яўгенія ЛЕСНІКАВА, 3 курс:
– За настрой. Журфак – гэта нейкая анамальная зона, дзе табе проста становіцца камфортна і весела. Ды і наогул, журфак – «гумарны» факультэт: і ў студэнтаў, і ў выкладчыкаў цудоўнае пачуццё гумару.



Віталь АРЭШКА, 2 курс:
– Ёсць адна рэч, якой нідзе, акрамя журфака, няма. Да нас запрашаюць весці заняткі журналістаў-практыкаў, прычым не толькі шараговых карэспандэнтаў, а начальнікаў аддзелаў, рэдактараў. Уласна, вось мая галоўная прычына любіць журфак.

Марына СІМАНАВА, 4 курс:
– За дух свабоды, лаяльнасці і творчасці. А яшчэ я люблю журфак за тое, што ён дапамог мне знайсці сябе.

Вераніка ПУСТАВІТ, 4 курс:
– За выкладчыкаў і дзясяткі разоў на дзень «прывітанне!» За знаёмых. За працаўнікоў мінікафэ і жанчын у сталоўцы. Дзякуючы журфаку пачала размаўляць па-беларуску.

Анастасія ШЧАГЛОВА, 3 курс:
– За тыя эмоцыі, якія дорыць журфак. За нябачную сувязь, якая фарміруецца паміж сябрамі-аднагрупнікамі, любімымі выкладчыкамі і шматлікімі аднадумцамі і якая мацнее з кожным днём студэнцтва!



Сяргей ЗЕЛЯНКО, выпуск 2005 г.:
– За тое, што даў мне любімую прафесію!

Уладзімір КАСЬКО, выпуск 1964 г.:
– Я б зноў пайшоў на журфак, калі б была такая магчымасць. Бо журналіст не прафесія, а прызванне.

Аляксандр ГРАДЗЮШКА, выпуск 1998 г.:
– За мэтанакіраванасць, за супрацоўніцтва, за вернасць ідэалам прафесіі!

Віктар ШЫМОЛІН, выпуск 1970 г.:
– За добрыя адносіны маіх калег і студэнтаў!

Іван САЧАНКА, выпуск 1965 г.:
– За цудоўных людзей, якія заўсёды акружалі мяне ў творчай дзейнасці!

Алег СЛУКА, выпуск 1968 г.:
– За тое, што ён даў мне цудоўнае і цікавае журналісцкае і навуковае жыццё!

Ганна КУРЭЙЧЫК, выпуск 1998 г.:
– За атмасферу, за людзей, за прафесіяналізм, натхненне і імпэт!

Таццяна СІЛІНА-ЯСІНСКАЯ, выпуск 2000 г.:
– За тое, што стаў мне сям'ёй!

Дзмітрый ДРАЗДОЎ, выпуск 1987 г.:
– За сапраўднае журналісцкае брацтва. Калі я бачу журналіста, то ў галаве самі сабой гучаць словы: «Мы з табой адной крыві – ты і я!»

Людміла САЯНКОВА, выпуск 1979 г.:
– За раскошу чалавечых стасункаў, за асаблівых студэнтаў, якія ў меру акадэмічныя і ў меру дэмакратычныя, за захаванне традыцый, за магчымасць прафесійнага росту.

Таццяна ПРАНОВІЧ, выпуск 1981 г.:
– За адчуванне вечнай маладосці,

якую дораць творчыя адносіны са студэнтамі.

Вячаслаў БУЛАЦКІ, выпуск 1975 г.:
– За тое, што з маленства і на ўсё жыццё звязаны з журфакам!

Таццяна АРЛОВА, выпуск 1959 г.:
– За цудоўных студэнтаў, якія пастаянна трымаюць у тонусе!

Ніна ФРАЛЬЦОВА, выпуск 1967 г.:
– За тое, што ён захоўвае мне маладосць!

Валерый ШЭІН, выпуск 1964 г.:
– За тое, што ён даў мне цудоўную прафесію, якая дазваляе не толькі вучыцца і вучыць, але і любіць тых, хто з табой побач!

Васіль ВАРАБ'ЁЎ, выпуск 1979 г.:
– За творчасць!

Раіса МЕЛЯШЭВІЧ, выпуск 1999 г.:
– За вечны аптымізм, маладосць, бадзёрасць духу і крэатыў!

Таццяна ПАДАЛЯК, выпуск 1986 г.:
– За непрадказальнасць!

Сцяпан ГОВІН, выпуск 1965 г.:
– За журфак! Гэта ўсё маё жыццё!

Наталля ФЯДОТАВА, выпуск 1999 г.:
– За Настаўнікаў!

Дзмітрый СІНЯЎСКІ, выпуск 2005 г.:
– За магчымасць прафесійна ўдасканальвацца!

Анатоль САЛАЎЁЎ, выпуск 1993 г.:
– За тое, што я з ім палову жыцця.

Святлана ХАРЫТОНАВА, выпуск 2007 г.:
– За студэнтаў і за выкладчыкаў, за выключны калектыў, за прафесіяналізм!

Арцём КАВАЛЕЎСКІ, выпуск 2001 г.:
– За своеасаблівы вольны дух і за дух творчасці!

Кацярына ГУРТАВАЯ, выпуск 2003 г.:
– За ўсё!

Алеся КУЗЬМІНОВА, выпуск 2013 г.:
– За здзяйсненне мар!

Галіна ГУРКОВА, выпуск 2004 г.:
– Проста я не ўяўляю свайго жыцця без журфака!

Інстытут журналістыкі Б

151
штатных супрацоўнікаў

1439
навучэнцаў (лістапад 2014 г.)

8375
выпускнікоў за 70 гадоў

Колькасць выпускнікоў па гадах
(слупковая дыяграма ніжэй па шкале часу)

Дзённае аддзяленне | Завочнае аддзяленне | Вячэрняе аддзяленне | Аддзяленне міжнароднай журналістыкі | Перападрыхтоўка на ФПіПК | Магістратура (беларускія навучэнцы) | Магістратура (замежныя навучэнцы)



Ліс Уладзімір Ігнатавіч,
дэкан факультэта журналістыкі



Зярніцкі Марк Саламонавіч,
загадчык аддзялення журналістыкі

Булацкі Рыгор Васільевіч,
загадчык аддзялення журналістыкі з 1955г., дэкан факультэта журналістыкі з 1967г.

Акулаў Гаўрыіл Сяргеевіч,
загадчык аддзялення журналістыкі

Фактаровіч Давід Яўсеевіч,
загадчык аддзялення журналістыкі

9 жніўня 1944 г.
у БДУ адкрыты факультэт журналістыкі

Пераезд на Чырвонаармейскую, 6

1956 г.
Адкрыта аспірантура

1959 г.
Выйшаў першы нумар студэнцкай газеты «Журналіст»



Пераезд у корпус універсітэцкага гарадка

Пераезд на Маскоўскую, 15

1979 г.
Пачалася падрыхтоўка замежных студэ



Журналістыка

Кафедра перыядычнага друку
Час стварэння: 1998 год на базе кафедры тэорыі і практыкі журналістыкі

Выпускаючая па спецыяльнасці *«Журналістыка (друкаваныя СМІ)»*
Колькасць студэнтаў на спецыяльнасці **344**
Загадчык: ***В. М. Самусевіч***
Колькасць супрацоўнікаў..... **26**
З іх штатных.....9
Сумяшчальнікаў.....17
Магістраў навук.....2
Кандыдатаў навук.....15
Дактароў навук.....1
Асноўныя дысцыпліны:
«Аналітычная журналістыка»; «Апрацоўка візуальнай інфармацыі кнігі»; «Апрацоўка выяўленчай інфармацыі ў СМІ»; «Апрацоўка тэкставай інфармацыі ў СМІ»; «Архітэктоніка публіцыстычных жанраў»; «Асновы журналістыкі»; «Асновы творчага майстэрства»; «Асновы тэхнічнага рэдагавання»; «Асновы фатаграфіі»; «Аўтарская журналістыка»; «Беларусь у сістэме міжнародных гаспадарчых сувязяў»; «Выданні для дзяцей і падлеткаў»; «Выпуск вучэбнай газеты»; «Дзіцячая перыёдыка»; «Дызайн газеты»; «Журналісцкае майстэрства»; «Журнальная перыёдыка Рэспублікі Беларусь»; «Інфаграфіка»; «Камп'ютарная вёрстка»; «Кнігазнаўства»; «Мастацка-тэхнічнае афармленне выданняў»; «Пытанні аграэканомікі»; «Рэгіянальныя СМІ»; «Сацыяльна-бытавая праблематыка ў сучаснай прэсе (метадалагічны аспект)»; «Сучасная газетная графіка»; «Сучасная паліграфія»; «Тэарэтычныя аспекты даследавання друкаваных СМІ»; «Тэорыя і практыка журналістыкі»; «Фірменны стыль часопіса».

Кафедра тэлебачання і радыёвяшчання
Час стварэння: восень 1967 г.

Выпускаючая па спецыяльнасці *«Журналістыка (аўдыявізуальная)»*
Колькасць студэнтаў на спецыяльнасці **391**
Загадчык: ***В. Р. Булацкі***
Колькасць супрацоўнікаў..... **30**
З іх штатных.....10
Сумяшчальнікаў.....20
Магістраў навук.....1
Кандыдатаў навук.....8
Асноўныя дысцыпліны:
«Тэхналогіі тэлебачання і радыёвяшчання»; «Тэхніка тэле- і радыёмаўлення (а/в)»; «Тэхніка тэлебачання і радыёвяшчання»; «Методыка радыёжурналістыкі»; «Методыка тэлежурналістыкі»; «Выпуск радыёпраграм»; «Выпуск тэлепраграм»; «Публіцыстычныя жанры і формы ў радыёжурналістыцы»; «Публіцыстычныя жанры і формы ў тэлежурналістыцы»; «Праграмаванне ў радыёвяшчанні»; «Праграмаванне ў аўдыявізуальных медыя»; «Мастацкае вяшчанне на радыё і тэлебачанні»; «Актуальныя праблемы сучаснасці і радыёжурналістыка»; «Актуальныя праблемы сучаснасці і аўдыявізуальная журналістыка»; «Асновы творчага майстэрства тэлежурналіста»; «Асновы творчага майстэрства радыёжурналіста»; «Тэорыя тэлежурналістыкі»; «Тэорыя радыёжурналістыкі»; «Грамадска-палітычная праблематыка тэлебачання і ідэалагічны працэс»; «Грамадска-палітычная праблематыка радыё і ідэалагічны працэс»; «Аўтарскае тэлебачанне»; «Аўтарскае радыёвяшчанне»; «Менеджмент аўдыявізуальных медыя»; «Менеджмент радыёвяшчання»; «Асновы тэлерадыёжурналістыкі».

Кафедра замежнай журналістыкі і літаратуры
Час стварэння: 10.10.1984 г.

Выпускаючая па спецыяльнасці *«Журналістыка міжнародная»*
Колькасць студэнтаў на спецыяльнасці **177**
Загадчык: ***Т. М. Дасаева***
Колькасць супрацоўнікаў.....16
З іх штатных.....9
Сумяшчальнікаў.....7
Кандыдатаў навук.....5
Дактароў навук.....2
Асноўныя дысцыпліны:
«Асновы міжнароднай журналістыкі»; «Замежная літаратура»; «Сусветная рэкламная індустрыя»; «Асновы творчай дзейнасці журналіста-міжнародніка»; «Гісторыя замежнай журналістыкі»; «Дзейнасць сусветных інфармацыйных агенцтваў»; «Інфраструктура і тэхналогіі замежных СМІ»; «Тэорыя і практыка замежнай журналістыкі»; «Сучасная сусветная палітыка і СМІ»; «Эканамічная інфармацыя ў замежных СМІ»; «Медыяэкспарт і міжнародная журналістыка»; «Міжнародная спартыўная журналістыка»; «Гісторыя замежнай журналістыкі»; «Журналістыка меркаванняў і расследаванняў»; «Журналістыка міжнародных навін»; «Міжнародная праблематыка і методыка яе асвятлення ў аўдыявізуальных СМІ РБ»; «Міжнародная праблематыка і методыка яе асвятлення ў друкаваных СМІ РБ»; «Тэхналогіі палітычнага аналізу ў журналісцкай практыцы»; «Тэхналогіі эканамічнай журналістыкі»; «Асвятленне дзейнасці міжнародных арганізацый у беларускай прэсе»; «Свабода і сацыяльная адказнасць замежнага журналіста»; «Міжнародная журналістыка і палітыка»; «Міжнародная эканоміка і СМІ».

Кафедра медыялогіі і вэб-журналістыкі
Час стварэння: 20 красавіка 1998 г.

Выпускаючая па спецыяльнасці *«Журналістыка (вэб-журналістыка)»*
Колькасць студэнтаў на спецыяльнасці **127**
Загадчык: ***В. П. Вараб'ёў***
Колькасць супрацоўнікаў..... **20**
З іх штатных.....14
Сумяшчальнікаў.....6
Магістраў навук.....2
Кандыдатаў навук.....7
Дактароў навук.....1
Асноўныя дысцыпліны:
«Сацыялогія»; «Прафесійная этыка журналіста», «Прававыя асновы журналістыкі»; «Эканоміка і менеджмент СМІ»; «Паліталогія журналістыкі»; «Журналістыка і бізнес»; «Сацыялогія журналістыкі»; «Псіхалогія журналістыкі»; «Тэхналогіі інтэрнэт-журналістыкі»; «Асновы інтэрнэт-журналістыкі», «Вэб-дызайн»; «Асновы творчай дзейнасці вэб-журналістыкі»; «Выпуск інтэрнэт-газеты»; «Камп'ютарная графіка»; «Праблематыка інтэрнэт-СМІ»; «Методыка інтэрнэт-журналістыкі»; «Праграмнае забеспячэнне мультымед. выт.в.»; «Праграмаванне вэб-сайтаў»; «Менеджмент вэб-праектаў»; «Журналісцкае майстэрства»; «Інтэрнэт-маркетынг»; «Замежныя інтэрнэт-СМІ»; «Актуальныя пытанні сучаснасці і інтэрнэт-СМІ»; «Асновы літаратурна-мастацкай творчасці»; «Эканоміка і менеджмент камунікацыі»; «Асновы аўтарскага права ў кнігавыдавецтве».

Кафедра тэхналогій камунікацыі
Час стварэння: 26 красавіка 1999 г.

Выпускаючая па спецыяльнасці *«Інфармацыя і камунікацыя»*
Колькасць студэнтаў на спецыяльнасці **122**
Загадчык: ***І. У. Сідорская***
Колькасць супрацоўнікаў **19**
З іх штатных.....7
сумяшчальнікаў..... 12
Магістраў навук.....2
Кандыдатаў навук.....7
Асноўныя дысцыпліны:
«Тэорыя камунікацыі»; «Тэорыя і практыка сувязяў з грамадскасцю»; «Тэорыя і практыка рэкламы», «Палітычная камунікацыя», «Мультымедыйныя тэхналогіі камунікацыі», «Карпаратыўныя медыя», «Дзелавая камунікацыя», «Інфармацыйны менеджмент у вэб-асяроддзі», «Гендарная камунікацыя», «Этыка камунікацыйнай дзейнасці», «Сацыялогія камунікацыі», «Міжнародная камунікацыя», «Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі», «Маркетынгавыя камунікацыі», «Сучасныя тэхналогіі масмедыя», «Тэхналогіі інтэрнэт-камунікацыі», «Метады даследавання камунікацыі», «Брэндынг», «Антыкрызісная камунікацыя» «Унутрыарганізацыйны менеджмент», «Інтэрнэт-маркетынг».

Кафедра журналіс і менеджм
Час стварэння: (з 1 чэрвеня 20 журналістыкі і
Выпускаю па спецыя «Журналіс *сродкаў м*
Колькасць на спецыя
Загадчык:
Колькасць 3 іх штатн
Сумяшчал
Магістраў
Кандыдата
Дактароў
Асноўныя д
«Гісторыя бела рускай журнал ту»; «Гісторыя с «Інтэграваны м менеджмент СМ СМІ»; «Тэорыя і менеджменту С вэб-праектаў»; «Прававое рэгу «Аптымізацыя і «Сучасны рына «Медыяхолдын тэхналогіі СМІ» асяроддзя рэда

БДУ 1944–2014



Выпускнікамі журфака сталі грамадзяне 65 краін свету

1998 г.
Адкрыты курсы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў кнігавыдання і СМІ

1998 г.
Пачаў працаваць вучэбны цэнтр камунікацыйных тэхналогій

12 лютага 2008 г.
Інтэрактыўная лекцыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі

Пераезд на Кальварыйскую, 9

2008 г.
Факультэт журналістыкі рэарганізаваны ў Інстытут журналістыкі БДУ



Ткачоў Павел Іванавіч,
дэкан факультэта журналістыкі

Слука Алег Георгіевіч,
дэкан факультэта журналістыкі



Дарашчонак Пётр Леанідавіч,
дэкан факультэта журналістыкі

Вараб'ёў Васіль Пятровіч,
дэкан факультэта журналістыкі

Дубовік Сяргей Валянцінавіч,
дырэктар-дэкан Інстытута журналістыкі

1991 г.
Створаны спецыялізаваны савет па абароне кандыдацкіх дысертацый

1997 г.
Адкрыты падрыхтоўчыя курсы для абітурыентаў

2000 г.
Створаны спецыялізаваны савет па абароне доктарскіх дысертацый

2010 г.
Аднавіў паўнамоцтвы савет па абароне дысертацый Д 01 02 08



Спецыяльнасці і спецыялізацыі факультэта журналістыкі (па часе адкрыцця)

Журналістыка (друкаваныя СМІ)
Журналістыка (аўдыявізуальная)
Інфармацыя і камунікацыя
Журналістыка міжнародная
Літаратурная работа (рэдагаванне)
Журналістыка (вэб-журналістыка)
Журналістыка (менеджмент СМІ)
Літаратурная работа (творчасць)

Спецыяльнасці факультэта перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі (па часе адкрыцця)

Сродкі масавай інфармацыі
Літаратурна-мастацкая творчасць
Камунікацыя ў сферы грамадскіх сувязяў
Фотажурналістыка
Інтэрнэт-журналістыка
Руская мова як замежная
Спартыўная журналістыка

Інфаграфіка падрыхтавана ***Д. П. Сіняўскім*** *пры дапамозе студэнтаў 5 курса спецыяльнасці «Журналістыка (друкаваныя СМІ)»: П. Варанько, С. Іваненкі, А. Кірыленкі, Я. Лыскаўца, І. Свяцкай*

гісторыі
тыкі
менту СМІ
1 снежня 1965 г.
14 г. – кафедра гісторыі
менеджменту СМІ)
чая
льнасці
тыка (менеджмент
асавай інфармацыі)»
ь студэнтаў
льнасці **72**
Д. М. Драздоў
ь супрацоўнікаў..... **12**
ых..... **6**
ьнікаў..... **6**
навук..... 3
аў навук..... 6
навук..... 1
дысцыпліны:
руская журналістыкі»; «Гісторыя
істыкі»; «Гісторыя менеджмен-
ацыяльнай камунікацыі»;
одуль "Гісторыя"»; «Эканоміка і
МІ»; «Тэхналогіі менеджменту
практыка сучаснага
СМІ»; «Менеджмент
«Псіхалогія менеджменту»;
уляванне менеджменту СМІ»;
маніторынг дзейнасці СМІ»;
к масавай інфармацыі»;
гі ў сістэме СМІ»; «Рэкламная
; «Менеджмент унутранага
акцыі».

Кафедра стылістыкі і літаратурнага рэдагавання
Час стварэння: 29 кастрычніка 1969 г.
Выпускаючая па спецыяльнасці *«Літаратурная работа (рэдагаванне)»*
Колькасць студэнтаў на спецыяльнасці **65**
Загадчык: ***В. І. Іўчанкаў***
Колькасць супрацоўнікаў..... **24**
З іх штатных..... 18
Сумяшчальнікаў..... 6
Магістраў навук..... 4
Кандыдатаў навук..... 11
Дактароў навук..... 2
Асноўныя дысцыпліны:
«Асновы культуры мовы журналіста»; «Асновы літаратурна-рэдактарскай дзейнасці»; «Асновы творчай дзейнасці рэдактара»; «Мова і стыль сродкаў масавай камунікацыі»; «Мова сродкаў масавай камунікацыі»; «Камунікатыўная лінгвістыка»; «Тэорыя і практыка перакладу»; «Лінгвістыка публіцыстычнага тэксту»; «Літаратурнае рэдагаванне»; «Медыярыторыка»; «Методыка літаратурнага рэдагавання»; «Стылістыка»; «Сучасная беларуская мова»; «Рэдагаванне інфармацыйных матэрыялаў»; «Рэдагаванне мастацка-публіцыстычных матэрыялаў»; «Рэдагаванне аналітычных матэрыялаў»; «Дыскурсны аналіз СМІ»; «Рэдагаванне мастацкай літаратуры»; «Методыка рэдагавання навуковай і навукова-папулярнай літаратуры»; «Руская мова як замежная»; «Прафесійная лексіка»; «Тэксталогія»; «Тэорыя тэксту»; «Мова і стыль інтэрнэт-выданняў».

Кафедра тэорыі і метадалогіі журналістыкі
Час стварэння: 2005 г.
Выпускаючая па спецыяльнасці *магістратуры*
Колькасць студэнтаў на спецыяльнасці **40**
Загадчык: ***С. В. Дубовік***
Колькасць супрацоўнікаў..... **13**
З іх штатных..... 6
Сумяшчальнікаў..... 7
Магістраў навук..... 1
Кандыдатаў навук..... 8
Дактароў навук..... 2
Асноўныя дысцыпліны:
«Тэорыя і метадалогія журналістыкі»; «Сацыялінгвістыка»; «Тэорыя журналістыкі»; «Міжкультурная камунікацыя і СМІ»; «Прафесійная этыка журналіста»; «Літаратурнае рэдагаванне»; «Асноўныя тэндэнцыі развіцця журналістыкі на сучасным этапе»; «Тэорыя і методыка даследавання сучасных СМІ»; «Тэхналогія інтэрв'ю»; «Падрыхтоўка медыятэксту і праца з ім»; «Асновы менеджменту медыясферы»; «Станаўленне і перспектывы мультымедыйных тэхналогій»; «Маркетынгавыя камунікацыі»; «Тэорыя кіравання»; «Тэорыя і практыка журналістыкі»; «Прававое рэгуляванне камунікацыі»; «Журналісцкая дзейнасць у інфармагенцтве»; «Геапалітычная канцэпцыя сусветнага развіцця»; «Невербальная камунікацыя ў міжкультурных зносінах»; «Актуальныя пытанні сучаснасці і інтэрнэт-СМІ»; «СМІ Саюзнай дзяржавы і СНД»; «Структура гіпертэксту сучасных аўдыявізуальных медыя»; «Канвергентныя прынцыпы гуманітарных даследаванняў».

Кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі
Час стварэння: 27 мая 1998 г.
Выпускаючая па спецыяльнасці *«Літаратурная работа (творчасць)»*
Колькасць студэнтаў на спецыяльнасці **33**
Загадчык: ***Л. П. Саянкова-Мельніцкая***
Колькасць супрацоўнікаў..... **21**
З іх штатных..... 9
Сумяшчальнікаў..... 12
Магістраў навук..... 2
Кандыдатаў навук..... 8
Дактароў навук..... 3
Асноўныя дысцыпліны:
«Асновы літаратурна-мастацкай творчасці»; «Літаратурна-мастацкая крытыка»; «Метадалогія аналізу тэксту»; «Беларуская літаратура»; «Руская літаратура»; «Культуралогія»; «Гісторыя мастацтваў»; «Маркетынгавыя стратэгіі прасоўвання літаратурнага кантэнту»; «Гісторыя сусветнага кінамастацтва»; «Тэорыя драмы»; «Музыкальная журналістыка»; «Міф і культура»; «Тэатральная журналістыка»; «Метадалогія аналізу мастацкага твору»; «Нацыянальныя каштоўнасці і экранная культура»; «Культура і бізнес»; «Аўтарскія стратэгіі ў мастацкім творы»; «Паэтыка мастацкай прозы»; «Мастацкі пераклад асобных відаў літаратуры»; «Асновы паэтычнага майстэрства»; «Сучаснае літаратуразнаўства і літаратурная крытыка»; «Сучасны кінапрацэс і СМІ»; «Асновы кінадраматургіі»; «Феномен інтэртэкстуальнасці ў сучаснай медыяпрасторы».

Кафедра англійскай мовы і маўленчай камунікацыі
Час стварэння: 19 снежня 1999 г.
Колькасць супрацоўнікаў..... **18**
Загадчык: ***В. У. Лушчынская***
З іх штатных..... **18**
Магістраў навук..... 3
Кандыдатаў навук..... 4
Дактароў навук..... 1
Асноўныя дысцыпліны:
«Англійская мова»; «Лінгвістычныя асновы міжкультурнай камунікацыі»; «Дыскурс-аналітычныя тэхналогіі ў гуманітарным навуковым даследаванні»; «Гісторыя замежных дзяржаўных устаноў»; «Тэорыя і практыка міжкультурных адносін»; «Сістэма камунікацый у турызме»; «Камунікацыйнае ўзаемадзеянне: перамовы»; «Інфармацыйныя кампаніі лабіравання»; «Кроскультурная камунікацыя ў кантэксце навуковага гуманітарнага даследавання».



В. М. Самусевіч,
намеснік дырэктара з 2005 г.:

– На працягу 70 гадоў ні на хвіліну не замірае рух журфака. Так, плануецца адкрыццё яшчэ адной спецыяльнасці магістратуры «Карпаратыўныя стратэгічныя камунікацыі», а таксама новай спецыяльнасці перападрыхтоўкі «Менеджмент і маркетынг СМІ». Пастаянна абнаўляецца змест вучэбных праграм, бо сучасны журналіст павінен не ісці, як кажуць, у нагу з часам, а бегчы наперадзе.

АДУКАЦЫЙНЫЯ ІНАВАЦЫІ

Першыя ў XXI стагоддзі

Факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Інстытута журналістыкі – гэта малады парастак магутнага дрэва БДУ з агромністай кронай – яго выпускнікамі, з глыбокімі і моцнымі каранямі – традыцыямі і навуковымі дасягненнямі. Сціплая, але моцная галінка, якая ўжо таксама мае сваю гісторыю.

Выпуск спецыяльнасці перападрыхтоўкі «Сродкі масавай інфармацыі»

Факультэт нарадзіўся 1 верасня 2008 года. На ім усяго 6 супрацоўнікаў – гэта дэкан Г. І. Басава, работнікі дэканата З. У. Варабей, В. В. Ламака, Н. М. Франчук, В. П. Мінец, А. А. Сыцько. Заўсёды побач з намі нашы памочнікі і дарадцы – рэктарат БДУ і выкладчыкі Інстытута журналістыкі.

Вопыт шасцігадовай працы паказаў, што перавага сучаснай сістэмы дадатковай адукацыі дарослых – у яе мабільнасці, хуткім рэагаванні на зменлівыя запатрабаванні ў кваліфікаваных кадрах. Таму навучанне на факультэце практыка-арыентаванае, сістэматычнае і праводзіцца высокакваліфікаванымі спецыялістамі, вядучымі выкладчыкамі, супрацоўнікамі цэнтральнага апарату розных міністэрстваў і ведамстваў нашай краіны, а таксама і замежнымі лектарамі.

Павышэнне кваліфікацыі накіравана на ўдасканаленне прафесійнага майстэрства спецыялістаў розных катэгорый. На факультэце ажыццяўляецца павышэнне кваліфікацыі больш чым па 40 адукацыйных праграмах.

Перападрыхтоўка забяспечвае атрыманне новай кваліфікацыі адпаведнага профілю адукацыі, садзейнічае напаўненню рынку працы кіраўнікамі і спецыялістамі з высокім узроўнем прафесійнай кваліфікацыі і кампетэнтнасці. Факультэт ажыццяўляе перападрыхтоўку па сямі спецыяльнасцях: «Сродкі масавай інфармацыі», «Літаратурна-мастацкая творчасць», «Камунікацыя ў сферы грамадскіх сувязей», «Фотажурналістыка», «Інтэрнэт-журналістыка», «Спартыўная журналістыка», «Руская мова як замежная».

За час працы факультэта ў адукацыйных праграмах павышэння кваліфікацыі прынялі ўдзел каля 4000 кіруючых работнікаў і спецыялістаў, дыпломы аб перападрыхтоўцы атрымалі каля 200 слухачоў.

Адукацыйныя праграмы, што ажыццяўляюцца на факультэце, унікальныя і не маюць дакладных аналагаў у сістэме дадатковай адукацыі дарослых у нашай краіне і за яе межамі. На гэта ўказвае ўдзел у праграмах слухачоў з Казахстана, Расіі, Украіны, Сірыі, Туркменістана.

А зараз слова нашым выпускнікам і слухачам.

Юлія Андрэеўна ЛЯСКОВА, прэс-сакратар Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь

Магу з дакладнасцю сказаць, што рашэнне аб перападрыхтоўцы было цалкам мэтанакіраваным і абгрунтаваным. Перападрыхтоўка дала мне магчымасць сістэматызаваць уласныя веды, пашырыць іх за кошт новай інфармацыі, навыкаў і сацыяльных сувязей. Прайсці перападрыхтоўку было для мяне вартым і таму, што якасць атрыманага дыплома пацвярджаецца яго канкурэнтнай здольнасцю.

Натхнення вам і моцы рухацца далей, да новых вяршынь і гарызонтаў.



Анастасія Віктараўна РАДЗІКЕВІЧ, намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Вясёлка»

Назва факультэта сцвярджае, што людзі, якія сюды прыходзяць, падрыхтаваныя і адукаваныя. Курс творчы, таму тыя, хто яго выбірае, гэта таленавітыя і яркія асобы. Гэта тыя, каму пашчасціла адчуць і патлумачыць сабе неабходнасць у атрыманні навуковых, метадычных ведаў у галіне літаратурна-мастацкай творчасці. Усе выкладчыкі – творцы, таленавітыя і вядомыя майстры сваёй справы.

Ірына Іванаўна ПЕТРУСЕВІЧ, галоўны рэдактар раённай газеты «Голас Касцюкоўшчыны»

Калі ў 2009 годзе з'явілася магчымасць атрымаць адукацыю журналіста, я ні на хвіліну не сумнявалася, адразу прыняла рашэнне ісці вучыцца. Не толькі веды, новую інфармацыю з тэорыі журналістыкі, практычныя навыкі дала мне вучоба, але і зносіны з цікавымі людзьмі – калегамі і выкладчыкамі.

Галоўнае, што навучанне садзейнічала асабістаму росту: я была прызначана галоўным рэдактарам газеты.

Шчыра жадаю Інстытуту журналістыкі БДУ далейшага росквіту, зацікаўленых і ўдзячных слухачоў і студэнтаў!

Валянціна Уладзіміраўна ШЛАПАКОВА, кіраўнік спраў Кастрычніцкага райвыканкама Гомельскай вобласці

Час вучобы на факультэце – час творчасці, натхнення і палёту. Мы пражывалі кожную лекцыю як першакласнікі. Здавалася, будучы на пасадах галоўных рэдактараў, а ў аўдыторыях – слухачамі, нас не павінна была адпусціць гаспадарчая штодзённасць, выпуск планавых нумароў. Забыўшыся на ўсё, мы апынуліся ў моры творчасці, эксперыментаў і ідэй. Вельмі важна, што мой дыпломны праект амаль адразу стаў рэальнасцю. Газета «Чырвоны Кастрычнік» пачала выходзіць штотыднёвікам у поўнакаляровым формаце.

Мару, каб мая дачка, як стане вашай студэнткай, ажыццявіла іншыя мае ідэі. Жадаю Інстытуту журналістыкі БДУ неабыякавых слухачоў і студэнтаў, новых спецыяльнасцей, фінансавай стабільнасці.

Людміла Васільеўна СКІБІЦКАЯ, загадчык кафедры журналістыкі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

На факультэт паступіла з прычыны вытворчай неабходнасці: адкрыццё спецыяльнасці «Журналістыка» ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце. Журналісцкая адукацыя істотна скарэкціравала маю выкладчыцкую дзейнасць. Замест любімай філалогіі спрабую сябе ў якасці журналіста.

Жадаю не зніжаць тэмпаў, адкрываць новыя спецыяльнасці. Кіраўніцтву, супрацоўнікам і выкладчыкам – здароўя і творчых адкрыццяў.

Аляксандр Аляксандравіч ТОМІН, прэс-сакратар ФК «Мінск»

Навучанне на факультэце дало магчымасць набыць тэарэтычную базу, якую буду спалучаць з практычнымі навыкамі, атрыманымі не толькі ў час навучання, але і за час працы ў журналістыцы. Вопыт працы ў спартыўнай галіне даволі значны: ёсць артыкулы, некалькі кніг, прысвечаных айчыннаму футболу.

Выказваю ўдзячнасць выкладчыкам за цікавыя лекцыі па спартыўнай журналістыцы, свежы погляд і неардынарную падачу матэрыялу.

Ганна Віктараўна ГРЫДЗЮШКА, журналіст-мадэратар турыстычнага партала Holiday.by

Дзякуючы факультэту павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі на сёння я гляджу на рускую мову вачыма замежніка. У кантэксце маштабных падзей у свеце і значнасці Беларусі на міжнародным узроўні мая практычная дзейнасць і абраная спецыяльнасць вельмі запатрабаваныя.

Я жадаю факультэту і надалей умела арганізоўваць праграмы навучання, зацікаўленых слухачоў, росквіту і выхаду на міжнародную арэну.

Віталій Паўлавіч ДЗЯМБОЎСКІ, памочнік начальніка ўпраўлення, прэс-сакратар Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС

Сучаснае жыццё немагчыма без інтэрнэту як крыніцы інфармацыі, навін, а для мяне – гэта яшчэ і атрыманая кваліфікацыя «Інтэрнэт-журналіст». Для спецыяліста ў сферы камунікацыі і грамадскіх сувязей праца з інтэрнэтам – адзін з асноўных напрамкаў.

Я жадаю факультэту павышэння кваліфікацыі Інстытута журналістыкі БДУ далейшага прафесійнага росту і поспехаў у падрыхтоўцы спецыялістаў.

Святлана Пятроўна ЗІМАГОРАВА, вядучы рэдактар аддзела ГУ «Палац Рэспублікі»

Я была вельмі рада, калі даведалася, што ў нашай краіне з'явілася магчымасць атрымаць дыплом фотажурналіста. Удзячна факультэту за знаёмства і працу з цікавымі і таленавітымі фотажурналістамі. Выкладчыкі дзеляцца з намі сваёй любоўю да фатаграфіі, да журналістыкі, умела, таленавіта перадаюць нам свой вопыт. Не сумняваюся, што гэта мой сапраўдны шлях да будучай прафесіі.

Сяргей Сяргеевіч ЧАБАТАРОЎ, прэс-сакратар Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь

У 2007 годзе закончыў факультэт журналістыкі па спецыяльнасці «Журналістыка (друкаваныя СМІ)». Пачаў працаваць у сістэме прэс-службы Міністэрства ўнутраных спраў РБ. Удзел у праграме «Сучасная прэс-служба» прывёў мяне да рашэння вучыцца далей. У год 70-годдзя Інстытута журналістыкі БДУ прыйшоў на перападрыхтоўку па сваёй спецыяльнасці.

Інстытуту журналістыкі БДУ жадаю заставацца дынамічным, маладым і творчым!

Таццяна Яўгеньеўна ХАРЛІНСКАЯ, кіраўнік прэс-службы ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама

Я закончыла факультэт журналістыкі БДУ. Прымала ўдзел у творчай, крэатыўнай праграме павышэння кваліфікацыі «Сучасная прэс-служба». Гэта і абумовіла маё рашэнне вучыцца далей.

Як кіраўнік прэс-службы ДАІ Мінска жадаю работнікам факультэта і Інстытута журналістыкі зялёнага святла на жыццёвых напрамках, двайной суцэльнай ад небяспек. І няхай толькі творчасць і прафесіяналізм лётаюць з павышанай хуткасцю.

Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ, галоўны рэдактар газеты «Універсітэт»

У 2010 годзе лёс прывёў мяне на ФПКП Інстытута журналістыкі, дзе я «падвучыўся» два найцікавейшыя і насычаныя падзеямі гады. Тут набыў безліч карысных ведаў і істотна пашырыў свой прафесійны кругагляд. Прыемна было апынуцца праз 10 гадоў пасля студэнцкай лавы ў такой «прасунутай» установе, супаставіць свой узровень з сучаснымі патрабаваннямі журналістыкі...

Асобна прыгадваю нашу дружную групу слухачоў. З вялікім задавальненнем стасаваўся з людзьмі «бывалымі», але ў той жа час ахвотнымі да новых перспектыў. Само сабой, цікава было займацца і з кампетэнтнымі выкладчыкамі, прычым не толькі іх паслухаць, але і падыскутаваць, а часам і паспрачацца:) Мы ж былі першым наборам спецыяльнасці «Друкаваныя СМІ» і як «першынцы» маглі дазволіць сабе такія вольнасці:) Асабліва адзначу спагадлівае кіраўніцтва факультэта і асабіста дэкана Ганну Іванаўну Басаву. Шчырае вам дзякуй за якасную працу.

З УСЯГО СВЕТУ

Міжнародная повязь

З ГІСТОРЫІ ФАКУЛЬТЭТА

А. А. РУДЭНКА, намеснік дэкана з 1986 па 2005 гг.:

– У 80-я гады перад факультэтам паставілі, здавалася, невыканальную задачу – падрыхтоўку журналістаў для замежных дзяржаў. На вучобу прыбыло каля 200 студэнтаў з 51 краіны. Увесь калектыў уключыўся ў распрацоўку навучальных планаў і праграм для замежнага аддзялення. І справіліся ж! Сёння выпускнікі факультэта працуюць у сродках масавай камунікацыі Аўстрыі і Польшчы, В'етнама і Манголіі, Палесціны і Емена; некаторыя з іх сталі палітычнымі і грамадскімі дзеячамі.

А. І. КОНАНАВА, куратар па міжнародным супрацоўніцтве:

– Сёння немагчыма гаварыць са студэнтамі пра журналістыку толькі апісальна, выключаючы галоўны складнік – рэальную сусветную практыку. Гэта праектная дзейнасць з еўрапейскімі медыяструктурамі, удзел у міжнародных мерапрыемствах і адукацыйным абмене.

Сёння мы ажыццяўляем адукацыйны праект з Хэнанскім універсітэтам Кітайскай Народнай Рэспублікі, які, спадзяёмся, таксама здабудзе пэўныя маштабы і вядомасць.

Вольга ВАЛЕ, кіраўнік праекта, Інстытут журналістыкі – Медыя інстытут Fojo:

– Адданасць традыцыям, уменне адгукацца на павевы часу і працаваць на перспектыву дазваляюць калектыву Інстытута журналістыкі заставацца ў шэрагах вядучых навучальных установ Еўропы.

Вольга Вале і Алена Конанава

Мы ведаем Інстытут журналістыкі як адзін з перспектыўных вучэбна-навуковых комплексаў, які паспяхова развівае міжнароднае супрацоўніцтва.

Прыкладамі эфектыўнага супрацоўніцтва можна назваць шматгадовыя кантакты і рэалізацыю навучальных праграм паміж вашым інстытутам і шведскім інстытутам Fojo.

Мы таксама жадаем калектыву Інстытута журналістыкі смелых праектаў і здзяйснення творчых задум, а БДУ далейшага развіцця на карысць Беларусі!

Наш інстытут – мара многіх!

Чжу Чжэньфэй, 1 курс

– Прыехаў з Кітая. Мне падабаецца журналістыка. Гэта добрая спецыяльнасць для нас у будучыні. Маё студэнцкае жыццё напружанае, але вельмі цікавае. Атрымліваю веды, неабходныя для працы. Я хачу быць ваенным карэспандэнтам.

Чэнь Юн'янь, магістрант

Я прыехала з Харбіна, у якім у 20 стагоддзі жыла вялікая колькасць рускіх, беларусаў і палякаў. Яны прымалі ўдзел у гарадскім будаўніцтве і дапамаглі Харбіну стаць развітым мегаполісам. Журналістыка – прафесія, якая патрабуе не толькі добра валодаць мовай, але яшчэ і пастаянна пашыраць веды ў такіх сферах, як філасофія, палітыка, эканоміка і г. д. Таму вучыцца на факультэце журналістыкі – мой самы добры выбар!

Лян Цзыняя, 3 курс:

– Кожны дзень кладуся спаць позна, рана ўстаю, я з радасцю хаджу ва ўніверсітэт, ведаю, што мяне там чакае шмат цікавага. Кажуць, гады вучобы ва ўніверсітэце найважнейшыя і незабыўныя ў жыцці чалавека. На журфаку мы атрымліваем новыя веды, вучымся жыць самастойна, жывём і размаўляем з людзьмі, вызначаем жыццёвы шлях і марым пра выдатную будучыню. Я берагу кожную секунду, праведзеную ва ўніверсітэце, і старанна вучуся для таго, каб дамагчыся сваёй мары.

Чжэн Бавэнь, 2 курс

Ужо трэці год, як я прыехала ў Беларусь. Гэта як быццам мая другая радзіма. Першы час у чужой краіне я была як нованароджанае дзіця. Але Інстытут журналістыкі стаў маёй надзейнай калыскай.

Тут добрая інфраструктура, выдатная адукацыя, каманда і высокакваліфікаваныя выкладчыкі. У гэтым інстытуце я магу атрымаць добрыя ўмовы для навучання і магчымасці для росту. Гэта адна з прычын, з якіх я выбрала Інстытут журналістыкі.

Лі Дэн, аспірант

– На факультэце працуюць выкладчыкі, якія даюць шырокі спектр ведаў для таго, каб стаць прафесійным журналістам. Тут я даведалася вельмі шмат новага, каб зразумець, што мой выбар быў правільны. Гэта дадае мне рашучасці працаваць больш, вучыцца лепш. Наш інстытут – мара многіх студэнтаў. Яго пастаянны прагрэс – гэта таксама і прагрэс студэнтаў, якія тут вучацца.

Дай Яньпэн, магістрант

– Я жадаю стаць журналістам і рабіць навіны – гэта значыць паведамляць людзям пра тое, што адбываецца ў свеце, што ўплывае на іх жыццё штосекунда. А значыць, быць датычным да лёсаў мільёнаў, да лёсаў сваёй краіны і ўсяго зямнога шара. Я выдатна разумею, якая адказнасць ляжыць на журналісце, ад яго слова часта залежаць жыцці людзей. Таму так важна быць прафесіяналам сваёй справы, увесь час вучыцца, удасканальвацца ў прафесіі. Таму Інстытут журналістыкі – найлепшы выбар!



Танака Хітошы, 3 курс

– Я перакананы, што зрабіў правільны выбар і знайшоў сваё прызначэнне. Мая мэта – стаць спартыўным журналістам. Мне дарагая кожная сустрэча з новымі сябрамі і выкладчыкамі, таму што гэтыя сустрэчы стануць шляхам да ажыццяўлення маёй мары.

Калдасава Меруерт, 1 курс

– Прафесія журналіста вельмі цікавая, ніколі не сядзіш на адным месцы. Журналіст павінен шмат ведаць, быць інтэлектуальным, таму я выбрала Інстытут журналістыкі. У нас выключныя выкладчыкі. Смачная ежа ў сталоўцы. Будынак новы. Мне ўсё вельмі падабаецца!

Лін Ханьбін, магістрант

– Сакрат казаў, што «недаследаваным жыццё не варта жыць». Думаю, што журналіст – заўжды даследчык. Таму мой выбар – магістратура журфака!

СЯБРОЎСКІЯ ВІТАННІ

Дарагія сябры!

Сардэчна віншую вас з 70-годдзем Інстытута журналістыкі!

На рахунку выпускнікоў Інстытута журналістыкі нямала важных спраў, назапашаны карысны досвед працы і ўсталяваныя трывалыя сувязі з партнёрамі ў расійскіх масмедыя, што ў немалой ступені спрыяе важным інтэграцыйным працэсам у рамках Саюзнай дзяржавы і Еўразійскага эканамічнага саюза.

Гэта вельмі важна, паколькі голас прэсы, якая выступае за гістарычную праўду, умацаванне нашых агульных культурных і духоўных каранёў, з'яўляецца адным з базавых элементаў гармоніі і дабрабыту нашых братэрскіх народаў.

Наперадзе вялікая і цікавая праца. Будзем рабіць яе разам.

А. А. СУРЫКАЎ,
Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі

Прыемна, што ў апошнія гады Інстытут журналістыкі актыўна развівае міжнароднае супрацоўніцтва з рознымі краінамі, у тым ліку і з Кітаем. Увесь прафесарска-выкладчыцкі склад прыкладае свае сілы на карысць развіццю ўсебаковага стратэгічнага партнёрства паміж КНР і РБ. Са сцен Інстытута журналістыкі ўжо выйшла шмат кітайскіх студэнтаў, якія зараз працуюць карэспандэнтамі або выкладчыкамі кітайскіх ВНУ. Мы высока ацэньваем тое, што зрабіў Інстытут журналістыкі для падрыхтоўкі прафесіяналаў СМІ і прыхільнікаў традыцыйнага кітайска-беларускага сяброўства. Пасольства КНР гатовае па-ранейшаму падтрымліваць сяброўскія адносіны з Інстытутам журналістыкі БДУ і садзейнічаць супрацоўніцтву паміж Інстытутам журналістыкі БДУ і кітайскімі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі.

ЦУЙ ЦЫМІН,
Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР

Гісторыя развіцця гэтага факультэта, які сёння стаў інстытутам з шырокім профілем спецыяльнасцей, гаворыць сама за сябе пра важнасць прафесіі журналіста, якая патрабуе сёння, як ніколі раней, вялізнай адказнасці не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім свеце.

У галіне інфармацыі сучасны свет не мае межаў, больш за тое, ён нават немагчымы без яе. Аднак неабходна падкрэсліць, што сэнс ажыццяўлення журналісцкай дзейнасці складаецца ва ўсеагульным сацыяльным праве народаў на атрыманне пэўнай і сур'ёзнай інфармацыі, і гэта павінна з'яўляцца найвышэйшай каштоўнасцю для СМІ.

Вы патрэбныя Беларусі і ўсяму свету!

ХЕРАРДА СУАРЭС АЛЬВАРЭС,
Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Куба

Ад імя Прадстаўніцтва ААН у Рэспубліцы Беларусь горача віншую Вас са знамянальнай датай – 70-годдзем факультэта журналістыкі. Хацеў бы адзначыць, што ў значнай ступені гэта свята і нашага прадстаўніцтва. Сцвярджаць так ёсць усе падставы. За час дзейнасці ў Беларусі Прадстаўніцтва Арганізацыі Аб'яднаных Нацый моцнымі нябачнымі сувязямі знітавана з факультэтам журналістыкі. Вашы выпускнікі, якія працуюць у розных СМІ, актыўна, ахвотна і аператыўна падаюць беларускай грамадскасці пэўную інфармацыю аб высілках, якія арганізуе ААН па забеспячэнні свету і ўстойлівага развіцця, як у маштабах планеты, так і на мясцовым узроўні.

В. У. РАДЗІВІНАЎСКІ,
глава Дэпартамента грамадскай інфармацыі ААН у Беларусі

Без усялякіх сумненняў, гэта знамянальная дата ў гісторыі беларускіх масмедыя. Гэта свята, якое звязвае журналістаў розных пакаленняў і краін.

Нам прыемна адзначыць, што пры непасрэдным удзеле студэнтаў і выкладчыкаў вашага факультэта рэалізуецца шырокі спектр сумесных беларуска-нямецкіх адукацыйных і сацыяльных праграм, якія спрыяюць збліжэнню народаў дзвюх краін.

Мы будзем шчаслівыя і ў далейшым супрацоўнічаць з Вамі на карысць паразуменню і прымірэнню паміж еўрапейскімі народамі.

В. Ф. БАЛАКІРАЎ,
старшыня дырэкцыі Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра імя Ёханэса Рау

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

Г. В. Курэйчык, намеснік дэкана па выхаваўчай рабоце:

«Журфак умее не толькі добра вучыцца!»

Добрай традыцыяй ушанавання памяці Настаўнікаў з вялікай літары, якія навучылі і выхавалі цэлыя пакаленні журналістаў, стала адкрыццё імянных аўдыторый Р. В. Булацкага, Е. Л. Бондаравай, Б. В. Стральцова. У дзень нараджэння апошняга на розных курсах праходзяць Урокі Стральцова.

Членамі прафсаюзнай арганізацыі з'яўляецца каля 90 % студэнтаў дзённага аддзялення, гэта амаль усе беларускія студэнты. Прафсаюзная арганізацыя на сёння самая масавая ў інстытуце.

Первічная арганізацыя БРСМ – ініцыятар і арганізатар шэрагу дабрачынных мерапрыемстваў для Дзіцячага дома № 5 г. Мінска і ветэранскай арганізацыі.

Самыя вясёлыя і актыўныя – студэнцкі саюз Інстытута журналістыкі. «Дзень першакурсніка», «Міс і Містар Журфак», «Залатая качка» – самыя запатрабаваныя і цікавыя забаўляльныя мерапрыемствы, што ладзяць студсаюзаўцы.

Большасць ініцыятыў савета старастаў скіраваны на прафесійнае ўдасканаленне і падтрыманне сяброўскіх адносін з іншымі ВНУ і прафесійнымі саюзамі. Гэта «Кубак журфака па пошуку інфармацыі», «Медыяпалігон-24», «Журналісцкая вясна» ў Кіеўскім інстытуце журналістыкі. Менавіта па прапанове савета старастаў на факультэце стаў шырока адзначацца Дзень роднай мовы, ператварыўшыся амаль у тыдзень прэс-канферэнцый, майстар-класаў, гульняў студэнтаў з выкладчыкамі на роднай мове.

Напрыканцы сакавіка штогод у Інстытуце журналістыкі распускаецца «PR-кветка». Студэнты спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыя» збіраюць міжнародную прафесійную супольнасць, абмяркоўваюць новыя напрамкі дзейнасці ў галіне грамадскіх зносін, праводзяць майстар-класы, конкурсы праектаў, стартапаў, знаходзяць сяброў і аднадумцаў.

Літаратурна-мастацкая лабараторыя «Крытык» працуе па розных кірунках – стварэнне альманахаў студэнцкіх работ, выпуск газеты «Пёры», навуковая дзейнасць і літаратурна-мастацкая крытыка. Студэнты на чале з кіраўніком лабараторыі У. А. Капцавым арганізавалі Рэспубліканскі адкрыты конкурс літаратурнай творчасці студэнтаў «БрамаМар».

На «Вуліцы летуценнікаў» заўсёды рады вітаць аматараў паэзіі і проста тых, хто не ўяўляе свайго жыцця без раманты кі.

Пляцоўкай для многіх выстаў, круглых сталоў, прэзентацый з'яўляецца бібліятэка факультэта. Дні кафедраў, персанальныя выставы выкладчыкаў, тэматычныя выставы, «Ноч у бібліятэцы», «Чытаем разам...» – цяжка пералічыць усе мерапрыемствы, якія сталі традыцыйнымі, чаканымі, любімымі.

Папоўніліся шэрагі перыядычных выданняў Інстытута журналістыкі. І зараз гэта не толькі студэнцкія газеты, а ўвесь спектр медыя: «ЖурФАКТЫ», «StudLive», «Вэб-журналіст», «Журфак-ТВ» «Пёры». Увесь кантэнт ствараецца намаганнямі студэнтаў.

У кабінеце па ідэалагічнай рабоце з моладдзю існуе своеасаблівы музей дасягненняў Інстытута журналістыкі, а іх сабралася за гады існавання вельмі шмат. Дзве «Залатыя літары», «Тэлевяршыня», два крыштальныя глобусы Tibo, дыпломы і пераможныя кубкі міжнародных студэнцкіх канферэнцый, Фэстывалю эстрады БДУ, «Капусніка», узнагароды журфакаўскіх медыя. Усё гэта сведчыць: наш журфак умее не толькі добра вучыцца!



Адказны за выпуск: **Вольга Міхайлаўна САМУСЕВІЧ**
Каардынатары праекта: Н. А. Зубчонак, І. Д. Воюш, Т. У. Сіліна-Ясінская

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

1 снежня 2014 года
Падпісана да друку 26.11.2014 г.
Зак. . Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК, камп'ютарная вёрстка Дзмітрый СІНЯЎСКІ
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by